

## Андрэй БУЦЬКО

вучань 5“Ж”класа  СШ №39 г. Гродна. Любіць спорт, захапляецца чытаннем, спрабуе пісаць вершы.

**ГЭЙ, ЗІМА!**

Гэй зіма, зіма, зіма!
Весялей цябе няма!
Любяць дзеці санкі, снежкі –
Столькі радасці, усмешак.
Але вось у чым бяда:
Няма снегу, ні сляда,
няма гульняў, лыжаў, санак
ну і радасці таксама.
І што ж гэта за зіма?
Студзень ёсць  – зімы няма!



**Дар’я РАДЗЮК**
вучыцца ў 5 “Ж”  класе СШ №39 г. Гродна. Захапляецца бісерапляценнем, вязаннем, шыццём. Займаецца плаваннем. Любіць жывёл.

***

Ой, ты, зімачка-зіма!
Як жа ты нас падвяла!
Каб ты снежнаю была
ды шмат снегу намяла,
мы б каталіся з гары
аж да смай да зары.



## Дар'я БУЛАШ

вучаніца 10 "Б" класа СШ №39 г. Гродна, выдатніца вучобы, член суполкі "Альшанскі перазвон". Пераможца шматлікіх алімпіяд па беларускай мове і літаратуры. Займаецца ў студыі выяўленчага мастацтва. Піша вершы.

**СНЕГІРЫ МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА**

У халодным свеце ранішняй зары
Па голлі, прыцярушаным сняжком,
Расселіся ў чаканні снегіры:
Ці прыйдзе той, хто добра ім знаёмы?

Дзяўчынка шыбавала па дарозе.
Міналі школа з возерам і роў…
Паружавелі шчочкі на марозе –
Спяшалася малая да сяброў.

Яе сустрэлі ўзрушаныя птушкі:
Дзяўчынка пачастунак несла ім.
Зляцеліся яны, як да кармушкі,
На паратунак у час галодных зім.

І з кволенькіх далоняў тых дзіцячых
Здзяўблі ўсё да крошкі  снегіры.
І ад чырвоных грудак іх гарачых
Рабілася так цёпла на душы...

Прайшлі гады... Нясе цяпер мой ветразь
Жыцця неўтаймаванага павеў.
Ды толькі не змаўкае ў маім сэрцы
Тых птушак-ліхтароў цудоўны спеў.



## Цімур ДЖАПАРАЎ

вучыцца ў 5 “Е”класе СШ №39 г. Гродна. Цікавіцца гісторыяй сваёй краіны і замежных. Любіць вандраваць па Беларусі. Пабываў у Нясвіжскім і Мірскім замках, Брэсцкай крэпасці і іншых месцах. Любіць паэзію і сам спрабуе пісаць вершы.

**ДЗЕ СНЕГ?**

Зіма ў хаце ўсё сядзела
Да нас ісці так не хацела
А я сняжок шукаў, шукаў
Ды хутка ў лесе заблукаў.
Ажно да Брэста я зайшоў
І ні  сняжынкі не знайшоў.
Сяджу, у акно гляджу, маўчу,
Мо дзе  сняжыначку ўсачу?
Нарэшце выпаў госць жаданы,
Бялюткі снег, доўгачаканы.
А, калі Новы год настаў –
Сняжок ісці зноў перастаў…



## Мария ИВАНОВА

ученица 6 “Б” класса СШ №36 с польским языком обучения. Любит читать и рисовать, пробует писать стихи.

### ЗИМА

Вьюга, снег, метель, пурга.
К нам, наконец, пришла зима.
Веселье, солнце и мороз…
А от мороза – красный нос.

Повсюду краски, огоньки.
Читает детвора стихи.
Подарки, ёлки и грушки.
Какао, мягкие ватрушки.

Снежки, коньки, сноуборд и санки,
Снежочек белый гладкий-гладкий.
Зима – ну, просто счастья миг!
Но мишку жалко, мишка спит.